**Список использованных источников**

1. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 740. Л. 6.
2. Дневники императора Николая II / под ред. К. Ф. Шацилло. – М.: Орбита, 1991. – 736 с.
3. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 740. Л. 198.
4. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 740. Л. 195.
5. *Дубенский, Д. Н.* Его Императорское Величество Государь Император Николай Александрович в действующей армии: в 4 т. / сост. ген.-майор Дубенский. – Петроград: М-во имп. двора, 1915–1916. – Т. 4: Июль 1915 г. – февраль 1916 г. – 238 с.
6. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 740. Л. 170.
7. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 740. Л. 171.
8. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 740. Л. 234.
9. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 740. Л. 206.
10. *Спиридович, А. И.* Великая Война и Февральская Революция 1914–1917 гг.: в 3 т. / А. И. Спиридович. – Нью-Йорк: Всеславянское Издательство, 1960–1962. – Кн. 1. – 308 с.
11. *Галушкин, Н. В.* Собственный Его Императорского Величества Конвой / под ред. П. Н. Стрелянова (Калабухина). – М.: Рейттаръ, 2004. – 416 с.
12. *Воейков, В. Н.* С царем и без царя: воспоминания последнего дворцового коменданта государя императора Николая II / В. Н. Воейков. – М.: Воениздат, 1995. – 430 с.
13. *Кондзеровский, П. К.* В Ставке Верховного. Воспоминания дежурного генерала при Верховном главнокомандующем / П. К. Кондзеровский. – Париж, 1967. – 129 с.
14. РГИА. – Ф. 237. Оп. 1. Д. 740. Л. 13.
15. РГАКФД. – Ал. 265а. Сн. 124.
16. РГАКФД. – Ал. 265. Сн. 76.

**(Дата подачи: 26.02.2021 г.)**

*А. Р. Раюк*
ТАА «БурВодСецьʼ»,  Мінск

*A. Rayuk*
BurVodSet LLC, Minsk

**УДК 94(476)«1907/1908»**

# УЗНІКНЕННЕ І ЗАНЯПАД КРАЁВАЙ ПАРТЫІ ЛІТВЫ І БЕЛАРУСІ (1907–1908)

# THE ORIGIN AND DECLINE OF THE REGIONAL PARTY OF LITHUANIA AND BELARUS (1907–1908)

*У артыкуле аналізуюцца прычыны ўзнікнення і заняпаду Краёвай партыі Літвы і Беларусі (1907–1908). Стварэнне было вынікам часовага ідэйнага кампрамісу прадстаўнікоў каталіцкіх кансерватыўных землеўласнікаў Мінскай, Віленскай і Гро-*

*дзенскай губерняў, каб стаць альтэрнатывай польскім «эндэкам» у Дзяржаўнай Думе Расійскай імперыі. Неспрыяльнае новае выбарчае заканадаўства і пачатак ідэйных разыходжанняў былі прычынамі заняпаду партыі.*

*Ключавыя словы: Краёвая партыя Літвы і Беларусі; краёвасць; беларускі палітычны кансерватызм; палітычная гісторыя Беларусі; Эдвард Вайніловіч; Дзяржаўная Дума Расійскай імперыі.*

*The article analyzes the causes of the origin and decline of the Regional party of Lithuania and Belarus (1907–1908). The creation was the result of a temporary ideological compromise of representatives of the Catholic conservative landowners of the Minsk, Vilna and Grodno Governorates to become an alternative to the Polish «National Democracy» in the State Duma of the Russian Empire. The unfavorable new electoral legislation and the beginning of ideological differences were the reasons for the decline of the party.*

*Keywords: Regional Party of Lithuania and Belarus; the Krajowcy; Belarusian political conservatism; political history of Belarus; Edward Voinilovich; the State Duma of the Russian Empire.*

Сярод значнай часткі каталіцкіх дваран шасці беларуска-літоўскіх губерняў Расійскай імперыі ў 1905–1917 гг. папулярнасцю карысталася т.зв. «краёвая канцэпцыя» («краёвая ідэя», «краёвасць»), цэнтральнай ідэяй якой было ўвядзенне ў Расійскай імперыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай аўтаноміі кіравання сваім беларуска-літоўскім «краем», што, як на думку «краёўцаў»-кансерватараў, так і «краёўцаў»-дэмакратаў, было патрэбна для лепшага развіцця беларуска-літоўскіх губерняў на аснове прававой, міжканфесіянальнай і міжнацыянальнай роўнасці і талерантнасці насельнікаў «края».

Для практычнай рэалізацыі сваіх ідэй праз парламенцкую дзейнасць «краёўцамі» было створана некалькі палітычных партый, сярод якіх гісторыя Краёвай партыі Літвы і Беларусі (1907–1908) апісана беларускім (А. Смалянчук) і польскім даследчыкамі (Д. Шпопер) [1–4]. Аднак, на нашу думку, гэтымі гісторыкамі недастаткова ўлічаны агульная палітычная сітуацыя ў Расійскай імперыі, традыцыі і настроі заснавальнікаў партыі, што дазваляе нам трошкі па-іншаму рэканструяваць падзеі і вызначыць прычыны ўзнікнення і заняпаду гэтага палітычнага праекта.

Д. Шпопер правільна паказаў, што галоўнымі распрацоўнікамі кансерватыўнага кірунка «краёвай канцэпцыі» і пачынальнікамі практычнай рэалізацыі ідэй «краёвасці» былі ўплывовыя прадстаўнікі Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі (МТСГ), на чале якіх стаяў Эдвард Вайніловіч [3, с. 30; 4, с. 240]. 7(20) кастрычніка 1905 г. яны на старонках віленскай газеты «Kurjer Litewski» апублікавалі палітычную праграму МТСГ [5]. Ідэю стварэння сваёй «краёвай партыі» краёўцы-кансерватары высоўвалі яшчэ з пачатку выбараў у І Дзяржаўную Думу Расійскай імперыі. 17 (30) лістапада 1905 г. у газеце «Kurjer Litewski» праграмную «Адозву Краёвай

партыі Літвы і Русі» [6], якая ў многім паўтарала палітычную праграму МТСГ, апублікаваў Раман Скірмунт (як упаўнаважаны ад імя прадстаўнікоў Мінскай губерні – кола ўплывовых лідараў МТСГ) [4, с. 242–243]. Чарговая, утрыманая ў ліберальна-кансерватыўным тоне адозва, якую таксама прыслаў Раман Скірмунт, была надрукавана 11 (24) студзеня 1906 г. у газеце «Kurjer Litewski» і заклікала да стварэння «Краёвай партыі Беларусі і Літвы» [4, с.243; 7]. Аднак у канечным выніку ў 1905–1907 гг. дэпутаты-краёўцы абмяжоўваліся ўваходам у шырокія парламенцкія кааліцыі ў Дзяржаўным Савеце і ў I і II Дзяржаўнай Думе Расійскай імперыі.

Толькі ў 1907 г. для выбараў у III Дзяржаўную Думу краёўцы-кансерватары вырашылі стварыць сваю партыю. Д. Шпопер сцвярджае, што прычынай актывізацыі многіх каталіцкіх дваран-кансерватараў Заходняга края (асабліва з Мінскай губерні) у справе стварэння «краёвай партыі» была параза на выбарах у II Дзяржаўную Думу: толькі 11 дэпутатаў у адрозненне ад 21 мандата у I Дзяржаўнай Думе [1, с. 173; 4, с. 251; 8, с. 466–472]. А. Смалянчук лічыць, што адсутнасць партыйных арганізацый значна паслабляла патэнцыял плыні «краёўцаў», а галоўным ініцыятарам бачыць Рамана Скірмунта (былога думскага дэпутата ад Мінскай губерні), які папрасіў Чэслава Янкоўскага (былога думскага дэпутата ад Віленскай губерні) дапамагчы яму ў заснаванні партыі [1, с. 235]. Сведчанне пра ініцыятарства Скірмунта і ход арганізацыйнага з'езду А. Смалянчук і Д. Шпопер бяруць толькі з адной крыніцы – мемуарнай кнігі Ч. Янкоўскага «W ciągu dwóch lat» (1908) [9, с. 136], які незадоўга да таго быў вясной 1907 г. са скандалам звольнены з пасады рэдактара газеты «Kurjer Litewski» [3, с. 22], а таму адчуваў сябе прыкра [9, с. і] і быў больш зацікаўлены ва ўласных апраўданнях перад уплывовым каталіцкім дваранствам у першую чаргу Віленскай губерні (з якой быў звязаны), чым дакладным апісанні стварэння партыі.

Янкоўскі сведчыць, што Скірмунт папрасіў Янкоўскага прыехаць у маі 1907 г. з Вільні ў Мінск, дзе на нарадзе вузкага кола ўплывовых членаў МТСГ было сумесна з Янкоўскім ухвалена, каб у Вільні быў скліканы з'езд прадстаўнікоў (галоўным чынам, каталіцкіх дваран-землеўласнікаў) з шасці губерняў – Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай. Прычым запрасіць толькі тых, пра якіх вядома, што яны не з'яўляюцца прыхільнікамі польскіх «эндэкаў» (Польскай нацыянальна-дэмакратычнай партыі), каб пазбегнуць на з'езде доўгіх дэбатаў адносна праграмных прынцыпаў [9, с.137].

Паводле Янкоўскага, у Вільні на з'ездзе 17–18 чэрвеня (1–2 ліпеня) 1907 г. Раман Скірмунт агучыў праект краёвай партыі ў форме шырокага партыйнага саюза з трох нацыянальных фракцый (польскай, літоўскай і беларускай), каб прывабіць і па максімуму прыцягнуць усе сацыяльныя і нацыянальныя групы ў беларуска-літоўскім краі – для стварэння аднаго агульнага краёвага саюза [9, с.137]. Аднак праект Скірмунта не быў падтрыманы

большасцю. Пасля доўгіх дэбатаў Краёвая партыя Літвы і Беларусі (КПЛБ) была створана як «польская» партыя без фракцый, хоць дыстанцуючая сябе ад ідэй «эндэкаў» і ўсялякіх форм нацыяналізму [4, с. 259].

А. Смалянчук лічыць, што адмова на віленскім з'ездзе стварыць краёвую партыю як міжнацыянальны партыйны саюз была выклікана той прычынай, што на арганізацыйным сходзе тон задавалі «тыя землеўласнікі, для якіх інтарэсы ўласнага маёнтку адыгрывалі, прынамсі, не меншую ролю, чым інтарэсы Краю» [10, с. 270]. І прыпісвае такія намеры ў тым ліку Эдварду Вайніловічу, які быў выбраны старшынёй партыі [10, с. 270]. У КПЛБ адмовіліся ўступіць прадстаўнікі Ковенскай губерні, бо праграма партыі не ўлічвала іх «сувязі» з літоўскім сялянствам, а таксама Раман Скірмунт [9, с. 137]. А. Смалянчук выказвае меркаванне, што Скірмунт, у адрозненне ад іншых, выступаў за больш радыкальныя падыходы ў вырашэнні аграрнага пытання – за продаж сялянам часткі прыватных дваранскіх маёнткаў [10, с. 270].

Аднак прыцягненнем новых фактаў і довадаў можна абгрунтаваць правільнасць іншых высноў адносна стварэння КПЛБ.

У II Дзяржаўную Думу па прычыне вялікага супрацьдзеяння расійскіх улад ад Мінскай губерні не было абрана ніводнага дэпутата-краёўца, а думскія дэпутаты-краёўцы ад іншых заходніх губерняў пачалі аглядацца на парламенцкія дзеянні польскіх «эндэкаў» [8, с. 230; 4, с. 250–251; 1, с. 174–176]. Краёўцы-кансерватары былі незадаволены ростам уплываў польскіх «эндэкаў» і лічылі, што для ўзмацнення сваіх палітычных пазіцый трэба стварыць уласную партыю на аснове «краёвай ідэалогіі» [3, с. 80–82]. Менавіта ў Віленскай губерні польскія «эндэкі» мелі найбольшы ўплыў у Заходнім краі, а Мінская губерня заўсёды была галоўным цэнтрам краёўцаў-кансерватараў. Таму праект краёвай партыі ствараўся мінскімі краёўцамі ў першую чаргу не для таго, каб у ёй структурна былі якія-небудзь нацыянальныя фракцыі ці абмяркоўваць аграрнае пытанне, а для таго, каб стварыць палітычную супрацьвагу польскім «эндэкам» у будучай III Дзяржаўнай Думе.

На наш погляд, адыход ад пачатковага «мінскага» праекта быў вынікам кампраміса на віленскім з'ездзе з боку прадстаўнікоў Мінскай губерні, каб краёвая партыя ўсё ж была створана супольна з прадстаўнікамі Віленскай і Гродзенскай губерняў. Праграму партыі падпісалі 23 дэлегата (з 30): 10 чалавек ад Віленскай губерні, 6 – ад Гродзенскай, 5 – ад Мінскай, 1 – ад Ковенскай (Міхал Мяйштовіч), а таксама Адам Замойскі – з польскіх губерняў. Лідар мінскіх краёўцаў-кансерватараў Эдвард Вайніловіч быў чалавекам вялікай палітычнай мудрасці і ўмеў ісці на прымальныя кампрамісы. У тыя часы ў верхняй палаце расійскага парламента (Дзяржаўным Савеце) дэпутаты ад Заходняга края (на чале якіх стаяў Вайніловіч) былі прыхільнікамі ліберальна-кансерватыўнага кірунка «краёвай ідэі», а ў

ніжняй палаце толькі ў I Дзяржаўнай Думе «краёвая канцэпцыя» мела абсалютную ідэйную перавагу сярод каталіцкіх дэпутатаў ад заходніх губерняў – бо з часу II Дзяржаўнай Думы сярод іх паступова расла папулярнасць ідэй «эндэкаў» разам са змяншэннем колькасці думскіх мандатаў. У сваіх мемуарах Вайніловіч адзначыў, што на супольных пазапарламенцкіх з’ездах каталіцкіх дэпутатаў ніжняй і верхняй палат ад заходніх губерняў іх рэзалюцыі былі альбо кампрамісныя, альбо з невялікай часовай перавагай адной з ідэйных пазіцый – краёўцаў ці эндэкаў [11, с.173]. Вайніловіч жа хацеў арганізацыйнай еднасці дэпутатаў ад заходніх губерняў на аснове «краёвай ідэі» як у верхняй, так і ніжняй палатах расійскага парламента, каб супольна дабівацца аўтаноміі свайго края ў Расійскай імперыі, таму шукаў прыхільнікаў.

Чэслаў Янкоўскі занатаваў, што арганізатары былі пастаўлены на з’ездзе ў Вільні перад выбарам: альбо радзіцца доўга, рызыкуючы, што не будзе дасягнуты станоўчы вынік; альбо згадзіцца («ад бяды») на пункты і параграфы, якія пазней можна будзе скарэктаваць ці замяніць [9, с.138]. Быў выбраны як раз другі варыянт, вынікам чаго стала стварэнне партыі і яе праграмы, што дало магчымасць для яе абмеркавання ў шырэйшым фармаце. Было вядома, што літоўскія і беларускія сялянскія ці інтэлігенцкія партыі былі вельмі неўплывовыя, налічвалі нязначную колькасць членаў і мелі абмежаваныя фінансавыя магчымасці, а таму з’яўляліся пакуль палітычна радыкальнымі і слабымі саюзнікамі для землеўласнікаў у прадвыбарчай кампаніі і парламенцкіх палатах.

У стварэнні партыі нельга прыпісваць пасіўную ці неканструктыўную пазіцыю мэтанакіраванаму Эдварду Вайніловічу, бо менавіта ў 1905–1911 гг. назіраецца найбольшы ўплыў краёўцаў-кансерватараў (на чале з Эдвардам Вайніловічам) у руху краёўцаў і краёўцаў у палітыцы ўвогуле. Памылкова таксама прыпісваць рознадумства Скірмунту і Вайніловічу ў той час: паводле слоў графа Іпаліта Корвін-Мілеўскага, Раман Скірмунт быў паплечнікам і «любімым вучнем» Эдварда Вайніловіча па гаспадарчай працы ў МТСГ і палітычнай дзейнасці [12, с.241]. Прычым план Скірмунта вельмі нагадвае прапановы Вайніловіча ў 1906 г. адносна стварэння «краёвай партыі», у якой маглі б злучыцца іншыя партыі і таварыствы «Літвы і Русі» без адмаўлення ад іх уласных лозунгаў [13].

На наш погляд, Эдвард Вайніловіч, які ў той час быў дэпутатам Дзяржаўнага Савета і страшынёй у ім групоўкі дэпутатаў «Саюз кол Каралеўства Польскага і Краёў Літвы і Русі», не планаваў быць лідарам партыйнай фракцыі ў Дзяржаўнай Думе, а таму ролю будучага лідара КПЛБ з самага пачатку адвёў свайму аднадумцу і «правай руцэ» – Раману Скірмунту, каб апошні ўзначаліў у будчым краёўцаў у ніжняй палаце расійскага парламента. А на віленскім з’ездзе ў 1907 г. у складанай сітуацыі рознагалосся дэлегатаў аўтарытэтнаму Вайніловічу прышлося самому ча-

сова ўзначаліць партыю замест маладога Скірмунта і пайсці на кампраміс. Гэта ўскосна пацвярджаецца тым, што (напэўна, не без уплыва Вайніловіча) у студзені 1908 г. у КПЛБ уступіў Скірмунт. І з таго часу менавіта Раман Скірмунт замест яе фармальнага кіраўніка Эдварда Вайніловіча працягнуў справу па ўмацаванні пазіцый партыі на палітычнай арэне края.

Скірмунт разгарнуў працу па пашырэнні сацыяльнай базы прыхільнікаў партыі, заяўляючы на старонках газеты «Kurjer Litewski» у палеміцы з Андрэем Тупальскім, што КПЛБ не з'яўляецца партыяй буйных землеўласнікаў, заснаванай для абароны толькі ўласных інтарэсаў [1, с. 243; 2, с. 185]. Ён таксама стаў ініцыятарам правядзення агульнапартыйнага схода, дзе планаваў правесці кардынальныя змены ў праграме партыі.

13 лютага 1908 г. у Вільні адбыўся сход партыі, на якім Раман Скірмунт зачытаў даклад «Развіццё прынцыпаў і мэт праграмы». На парадку дня схода таксама стаялі пытанні пра выбары новага кіраўніцтва партыі (па сутнасці – планаванага сыходу Эдварда Вайніловіча з пасады яе фармальнага кіраўніка і абрання Рамана Скірмунта), выхаду з партыі Станіслава Ваньковіча і Тадэвуша Дамбоўскага (якія далучыліся да грамадскага аб'яднання Польскі саюз краёвай працы), зацвярджэнне новай праграмы, якая б прывабіла больш шырокія колы насельніцтва (асабліва, сялян і інтэлігенцыю) і ператварыла партыю ў масавую палітычную арганізацыю. Сход ухваліў прапанаваныя прынцыпы рэарганізацыі партыі («Прынцыпы арганізацыі Краёвай партыі Літвы і Беларусі») і абраў Рамана Скірмунта кіраўніком партыі [1, с. 242–243; 2, с.186]. Прыкметна, што КПЛБ пачала складацца з двух («беларускага» і «польскага») аддзяленняў, якія павінны скаардынавана вырашаць уласныя задачы [1, с.243].

Улічваючы тое, што адсутнічала «літоўскае» аддзяленне сацыяльнай апорай партыі павінны былі служыць беларускія губерні Расійскай імперыі (у першую чаргу выключалася Ковенская губерня – асноўная тэрыторыя літоўскага нацыянальнага руху). Пераўтварэнні, на наш погляд, былі відавочнай праявай пэўнага зруху пазіцый партыі, заснаванай краёўцамі-кансерватарамі, у бок ліберальна-дэмакратычнай плыні «краёвасці» і імкнення наладзіць супрацоўніцтва дваран з беларускім сялянствам і інтэлігенцыяй, сярод якіх шукалася масавая падтрымка партыі. Так прынцыпы арганізацыі «краёвай партыі» прайшлі ў мінскіх краёўцаўкансерватараў эвалюцыю ад ідэі аб'яднання лідараў мясцовых каталіцкіх дваран Заходняга края («Літвы і Русі») у 1905 г. да супрацоўніцтва дваран і сялян толькі беларускіх губерняў.

Аднак КПЛБ хутка сышла з палітычнай арэны. Эдвард Вайніловіч у сваіх мемуарах адзначыў, што краёвая партыя была зганена прэсай польскіх «эндэкаў» і сустрэла непрыхільнае стаўленне мясцовай губернскай адміністрацыі беларуска-літоўскіх губерняў, дзе панавалі настроі рускага вялікадзяржаўнага шавінізму [11, с.175].

Галоўнымі прычынамі заняпаду КПЛБ, паводле нашай ацэнкі, былі знешнія абставіны: немагчымасць раўнапраўнай легальнай палітычнай дзейнасці. Расійскі імператар Мікалай II сваім Маніфестам ад 3 чэрвеня 1907 г. увёў змены ў выбарчы закон, якімі значна абмяжоўвалася магчымасць прадстаўніцтва нярускага і недваранскага (у першую чаргу – сялянскага) насельніцтва ў Дзяржаўнай Думе. Пасля завяршэння рэвалюцыі 1905–1907 гг. расійскі ўрад пачаў цвёрда праводзіць лінію на звужэнне праў «інародцаў» і абмежаванне іх прадстаўніцтва ў адміністрацыйных структурах, а з 1908 г. рэакцыйная палітыка расійскага ўрада пашырылася амаль ва ўсіх сферах жыцця дзяржавы. Як адзначыў Эдвард Вайніловіч у сваіх успамінах, мясцовыя расійскія ўлады сталі мець вырашальны ўплыў (у першую чаргу праз пратэкцыю, махінацыі і парушэнні працэдуры) на працэс выбараў у «заходніх губернях» сялянамі лаяльных уладзе дэпутатаў, а апошнія больш клапаціліся пра ўласныя падарункі і льготы ад губернскай адміністрацыі [11, с.175]. Гэта рабіла немагчымым адшуканне супольнай пляцоўкі ўсталявання палітычнага супрацоўніцтва паміж мясцовымі дваранамі і сялянамі ў рамках парламенцкай дзейнасці. Пачынаючы яшчэ з выбараў у II Дзяржаўную Думу (1906), «рускім» кандыдатам у дэпутаты мэтанакіравана дапамагаў расійскі ўрад і мясцовая губернская адміністрацыя, выкарыстоўваючы законныя і незаконныя метады паслаблення праціўніка і падтрымліваючы рускія нацыяналістычныя арганізацыі (галоўным чынам, т.зв. «чарнасоценцаў» – членаў «Саюза рускага народа»). А ў ходзе выбараў у III і IV Дзяржаўныя Думы на паражэнні «палякаў» у барацьбе за дэпутацкія мандаты паўплывала яшчэ і ўзрослая актыўнасць праваслаўнага святарства, якое падтрымлівалася ў ходзе прадвыбарчых кампаній «чарнасоценцамі» [8, с. 450–462]. У сваю чаргу краёўцы-кансерватары бачылі магчымасць рэалізацыі сваіх інтарэсаў толькі праз легальныя спосабы палітычнай дзейнасці і іх лаялісцкая пазіцыя адносна афіцыйных (расійскіх) улад не прадугледжвала радыкальных захадаў у палітычнай барацьбе.

Толькі пасля ўвядзення ў 1911 г. земстваў у Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай губернях асноўнай (хоць і абмежаванай) пляцоўкай адшукання паразумення паміж краёўцамі-кансерватарамі (галоўным чынам, з Мінскай губерні – членамі МТСГ), інтэлігенцыяй і сялянамі, на нашу думку, сталі земскія ўстановы.

Такім чынам, у ініцыятыве і арганізацыі КПЛБ галоўную ролю адыгралі каталіцкія маянтковыя краёўцы-кансерватары Мінскай губерні – лідары МТСГ на чале з Эдвардам Вайніловічам. Неабходнасць стварэння КПЛБ у 1907 г. тлумачыцца імкненнем краёўцаў-кансерватараў Мінскай губерні мець у III Дзяржаўнай Думе Расійскай імперыі сваіх дэпутатаў-краёўцаў (ад беларуска-літоўскіх губерняў), аб’яднаных у адной арганізацыі, якая б стала альтэрнатывай і канкурэнцыяй польскім «эндэкам» у Думе. Гэта свед-

чыць аб іх вялікай зацікаўленасці ў праекце. Само стварэнне партыі было вынікам часовага кампраміса прадстаўнікоў каталіцкіх землеўласнікаў-кансерватараў Мінскай, Віленскай і Гродзенскай губерняў, сярод якіх яшчэ не было расколу, але ўжо меліся выразныя ідэйныя разыходжанні.

Партыя змагла правесці ў ІІІ Дзяржаўную Думу толькі аднаго дэпутата (Ваньковіча), ужо мела ў Дзяржаўным Савеце Расійскай імперыі трох сваіх дэпутатаў (Вайніловіча, Мілеўскага, Дашкевіча), а пазней рэарганізавала сваю структуру і прынцыпы для пашырэння ўласнай сацыяльнай базы (у першую чаргу за лік беларускамоўных сялян і інтэлігенцыі) і праіснавала нядоўга (да 1908 г.). Прычыны заняпаду партыі былі як знешняга (змяненне выбарчага заканадаўства ў бок звужэння прадстаўніцтва нярускага насельніцтва і рост рэакцыйнасці палітыкі афіцыйных улад пасля заканчэння рэвалюцыі 1905–1907 гг. у Расійскай імперыі), так і ўнутранага характару (адмова ад радыкальных метадаў у палітычнай барацьбе і пачатак ідэйных разыходжанняў унутры каталіцкага маёнткавага дваранства Беларусі, якое канчаткова адбылося ў 1911 г. пасля ўвядзення земстваў у Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай губернях і іх неўвядзення ў Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях).

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Смалянчук, А. Ф.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.
2. *Смалянчук, А.* Раман Скірмунт (1868–1939): жыццяпіс грамадзяніна Краю / А. Смалянчук. – Мінск: Зміцер Колас, 2018. – 700 с.
3. *Szpoper, D.* Sukcesorzy Wielkiego Księstwa. Myśl polityczna i działalność konserwatystów polskich na ziemiach litewsko-białoruskich w latach 1904–1939 / D. Szpoper. – Gdańsk: Arche, 1999. – 357 s.
4. *Szpoper, D.* Gente Lithuana, Natione Lithuana. Myśl polityczna i działalność Konstancji Skirmuntt (1851–1934) / D. Szpoper. – Gdańsk: Arche, 2009. – 487 s.
5. Przed wyborami // Kurjer Litewski. – 1905. – № 31. – S. 1.
6. Odezwa Stronnictwa Krajowego Litwy i Rusi // Kurjer Litewski. – 1905. – № 65. – S. 1–2.
7. Odezwa Stronnictwa Krajowego Białej Rusi i Litwy // Kurjer Litewski. – 1906. – № 7–8. – S. 2.
8. *Jurkowski, R.* Sukcesy i porażki. Ziemiaństwo polskie Ziem Zabranych w wyborach do Dumy Państwowej i Rady Państwa 1906–1913 / R. Jurkowski. – Olsztyn: WUWM Olsztyn, 2009. – 550 s.
9. *Jankowski, Cz.* W ciągu dwóch lat...: Przyczynek do dziejów prasy polskiej na Litwie / Cz. Jankowski. – Warszawa-Kraków: Druk. W. L. Anczyca, 1908. – 201 s.
10. *Смалянчук, А.* Краёвец Эдвард Вайніловіч (1847–1928) / А. Смалянчук // «Краёвая ідэя» ў беларускай гісторыі: зб. навук. арт. / А. Смалянчук. – Мінск: Зміцер Колас, 2017. – С. 261–275.

11. *Woyniłłowicz, E.* Wspomnienia. 1847–1928 / E. Woyniłłowicz. – Wilno: Józef Zawadzki, 1931. – Cz. 1. – 368 s.

12. *Korwin-Milewski, H.* Siedemdziesiąt lat wspomnień (1855–1925) / H. Korwin-Milewski. – Poznań: Jan Jachowski, 1930. – 600 s.

13. *Woyniłłowicz, E.* Koło Polskie / E. Woyniłłowicz // Kurjer Litewski. – 1906. – № 80. – S. 2.

**(Дата падачы: 22.02.2021 г.)**

*Н. К. Рудаковский*
Военная академия Республики Беларусь, Минск

*Е. А. Макаренко*
Национальный архив Республики Беларусь, Минск

*N. Rudakovskiy*
Military Academy of  the Republic of Belarus, Minsk

*E. Makarenko*
National Archives of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 930.253(476)**

# ФОНДЫ НАЦИОНАЛЬНОГО АРХИВА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ КАК ИСТОЧНИК ИССЛЕДОВАНИЯ ПРОБЛЕМ ГРАЖДАНСКОГО НАСЕЛЕНИЯ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

# FONDS OF THE NATIONAL ARCHIVES OF THE REPUBLIC OF BELARUS AS A SOURCE FOR RESEARCH OF PROBLEMS CONCERNING CIVIL POPULATION DURING THE GREAT PATRIOTIC WAR

*В статье предпринята попытка выявления комплекса документов по проблемам гражданского населения на временно оккупированной территории Белоруссии в годы Великой Отечественной войны, хранящихся в фондах Национального архива Республики Беларусь. Авторами систематизированы и охарактеризованы различные группы источников, сделаны выводы о степени их репрезентативности.*

*Ключевые слова: гражданское население; Великая Отечественная война; архивный фонд; оккупационный режим; партизанское движение; подпольное движение.*

*The article attempts to identify a set of documents on the problems of the civil population in the temporarily occupied territory of Belarus during the Great Patriotic War, which are stored in the National Archives of the Republic of Belarus. The authors have systematized*